МАСТОЎСКАЯ ПРАЎДА + дайджэст
7 верасня 2005 года № 2
Грамадска - інфармацыйнае выданьне Мастоўшчыны

**Алесь Белакоз:**

***Нас выбівалі стагодзьдзямі, але зьнішчыць нас немагчыма!***



## З ўсёй краіны

### Кангрэс дэмакратычных сіл

*чацьвер, 11 жніўня 2005*

Паводле старшыні аргкамітэту Кангрэсу дэмакратычных сіл Аляксандра Бухвостава, сходы грамадзкасьці адбыліся ўжо ў 78 гарадох і мястэчках Беларусі. Абрана 166 дэлегатаў. Пераважна гэта буйныя гарады. Яшчэ плянуецца правесьці каля 50 сходаў, а ўвесь працэс вылучэньня дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сіл павінен скончыцца да 1 верасьня.

***Паводле радыё “Свабода”***

### Пэнсіянэры

*чацьвер, 11 жніўня 2005*

Паводле незалежных эканамістаў, праблема пэнсійнай рэформы будзе ўзрастаць і надалей у зьвязку са старэньнем насельніцтва Беларусі. Так, апошнімі гадамі колькасьць пэнсіянэраў павялічылася з 46 да 60 чалавек на кожную сотню людзей працаздольнага ўзросту. Гэткім чынам, сёньня ў краіне налічваецца 2,5 мільёны пэнсіянэраў, альбо 26% адносна працоўнага насельніцтва. Паводле прагнозаў, да 2025 году пэнсіянэры складуць 32% жыхароў краіны.

***Паводле радыё “Свабода”***

### *Рэйтынг*

*чацьвер, 11 жніўня 2005*

Зьвесткі закрытага апытаньня: ці давяраюць Лукашэнку ў сілавых структурах? Алесь Дашчынскі, Менск
Прэсавая служба АГП распаўсюдзіла патаемным чынам здабытыя зьвесткі закрытага апытаньня, якое праводзіцца раз на квартал у Міністэрстве ўнутраных справаў. Вынікі гэтых апытаньняў паступаюць толькі кіраўніку краіны, Радзе бясьпекі і КДБ. Паводле гэтага дасьледаваньня, рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі ў міліцэйскім асяродзьдзі не перавышае 33 працэнтаў. У Менску адпаведны паказчык роўны 19 працэнтам. Ва ўзброеных сілах Беларусі рэйтынг Лукашэнкі не перавышае 25 працэнтаў.

***Паводле радыё “Свабода”***

### *На белорусских предприятиях участились стихийные забастовки*

*15/08/2005*

В июле стихийные забастовки прошли на восьми минских предприятиях. Лидерами протестных настроений уже стали такие предприятия как МАЗ, НПО «Интеграл» и Мотовелозавод. В ближайшее время ожидается очередной всплеск, и не только по причине экономического состояния заводов. Более десяти заводов решено вынести за черту столицы, в том числе станкостроительное объединение им.Кирова и завод им.Ленина, сообщает пресс-служба ОГП.

***Паводле www.charter97.org***

### *Заработную плату работникам ОАО «Россоны» выдают кирпичами*

16/08/2005

Как сообщила во вторник "Интерфаксу" главный специалист Комитета государственного контроля Витебской области Елена Полубинская, этот факт установлен в ходе проверки предприятия. "В течение 5 месяцев выплаты заработной платы товаром - кирпичом собственного производства - составили почти Br17 млн.", - констатировала она. По ее словам, сейчас рассматривается вопрос о применении к предприятию экономических санкций и привлечению виновных должностных лиц к ответственности.

# Сьвята Беларускай музыкі

■ *Удзячны Слухач*

21- 22 ліпеня прайшоў 16-ты фэстываль беларускага року “Басовішча”. На яго зьехаліся людзі з розных куткоў Беларусі і Польшчы. Прысутнічалі таксама прадстаўнікі розных грамадзкіх арганізацый. Сам фэст праходзіў паблізу Мястэчка Грудак, што на Беласточчыне. Моладзь разьбіла намётны гарадок, дзе лunалі бел-чырвона-белыя сьцягі і паўсюль гучала беларуская мова.

*працяг на с. 2*




# Крэдытаваньне ў нас і ў іх

■ Вальдэмар Шульцман

***“У нас самыя лепшыя ўмовы крэдытаваньня будаўніцтва ў сьвеце, а ніжэйшых працэнтаў дык і ўвогуле ні ў воднай краіне ня знойдзецца.”***

Пачуўшы гэтыя словы ад прыемных жанчын, што працуюць ў райвыканкаме, я адчуў гонар за сваю дзяржаву і яе мудрую палітыку ў сфэры жыльлёвага будаўніцтва.

Сапраўдны, хто б з мастоўскіх сем'яў, што стаяць у чарзе на паляпшэньне жыльлёвых умоў, адмовіўся ад ільготнага крэдыта ў памеры 5 % гадавых на 20 год (а для шматдзетных 3% на 40 год). Менавіта такія ўмовы прадугледжаны Ўказам прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 сьнежня 2004 г. № 625 для населенных пунктаў з колькасьцю насельніцтва менш за 20 тыс.

Пасьля азнаямленьня з гэтым дакументам я адразу адчуў пяшчоту і моцную падтрымку рукі, што клапатліва, нібыта “крыштальны шар”, пераносіць мяне на толькі што пабудаваныя з дапамогай дзяржавы квадратныя мэтры жыльля.

Акрамя таго, я ўспомніў, што частку крэдыта можна пагасіць чэкамі “Жыльлё”, як абнадзеіла мяне адна знаёмая, што гады два таму пакрыла больш за палову кошту сваёй кватэры гэтымі чэкамі. Але тут мяне чакала невялікае расчараваньне - пяшчотная рука ўжо вырашыла пабыць крышку і жорсткай, “бацькоўскай”. Згодна з Дэкрэтам прэзыдэнта "Аб упарадкаваньні абарачэньня і выкарыстаньня імянных прыватызацыйных чэкаў “Жыльлё” чэкі павінны прайсьці перарэгістрацыю, пасьля чаго дзейнымі застаюцца толькі чэкі, налічаныя грамадзянам, атрыманымі імі ў спадчыну альбо па рашэньню суда, набытыя па дагаворам у блізкіх сваякоў. Але гэта ня самае галоўнае- згодна з дэкрэтам чэкі не індэксуюцца, а іх кошт складае намінальную сумму на дату іх выдачы. “Не заўсёды кату масьлам ласавацца” падумалася мне, ды і ня проста так жа ўсё зроблена, яму відней там, больш за тое, за 11 апошніх год я зразумеў, што прэзыдэнт заўсёды “праў”.

У мяне ўсё ж застаюцца самыя льготныя умовы крэдытаваньня і нізкія 5% ў сьвеце.

Але аднойчы ў размове са сваім знаёмым з Амэрыкі аб перавагах беларускай мадэлі разьвіцьця над іхняй заходняй, даведаўся, што ў іх па звычайных, ня льготных крэдытах выплачваецца ад 3% да 6% гадавых на працягу 15 - 40 год. Мне адразу падалося, што мой знаёмы вядзе супраць мяне інфармацыйную вайну, аб чым так часта папярэджвае наш лідэр. “Не!, трэба ўсё ж такі праверыць”,- прыйшла мне ў галаву крамольная думка. Як чалавек даверлівы, і ў чымсьці наіўны, я ня мог не давяраць нашым прыемным жанчынам з райвыканкам, а таксама і амэрыканец падаўся мне шчырым.



Пашукаўшы інфармацыю ў бібліятэках і сусьветным сеціве Internet, я са зьдзіўленьнем даведаўся, што, сапраўды, на будаўніцтва, рамонт і куплю жыльля ў краінах Эўропы, ЗША, Канады стаўка

*працяг на с. 2*

# Крэдытаваньне ў нас і ў іх

працяг. Пачатак на с.1

крэдыта вагаецца ад 3 % да 7%, і крэдыт можна ўзяць на тэрмін нават да 40 гадоў. Найбольш зьдзівіла Ірляндыя, некалі занядбалы куток Эўропы. Там можна ўзяць крэдыт пад 2,5% гадавых. І гэта былі звычайныя, ня льготныя крыдыты, узяць каторыя можа кожны.

Мне адразу захацелася даведацца, а што ў нас ёсьць для людзей, што жадаюць пабудаваць жыльлё, але ня маюць ільготаў. Але, напэўна, заняты бітвамі за ўраджай наш прэзыдэнт яшчэ ня меў часу, каб "перетрахаць" банкаўскую сфэру а, непасрэдна, крэдытаваньне будаўніцтва. На гэтую думку мяне навяла стаўкі Беларусбанка па няльготнаму крэдытаваньню жыльлёвага будаўніцтва, якая складае 16 % гадавых у беларускіх рублях і выдаецца на тэрмін да 15 гадоў на суму, што пакрывае да 90% кошту жыльля, для тых, хто стаіць у чарзе на паляпшэньне жыльлёвых умоў, і 22 %, для тых каму паляпшэньне не патрэбнае. (стаўка ў замежнай валюце складае адпаведна 12% і 16% і выдаецца на пэрыяд да 10 гадоў на сумму, што пакрывае да 75% кошту жыльля).

"Где правда, брат?" на секунду ўспыхнула ў маёй сьвядомасьці думка, але адразу за ёй прыйшла наступная. "На вайне, як на вайне!" Хоць і інфармацыйнай.

*Была скарыстана інфармацыя з Internet сайтаў:*
*www.mortgage.co.uk*
*www.bankofamerica.com*
*www.belarusbank.com.*
*www.ipoteca.ru*

# Алесь Белакоз: "Веру, што музей не памрэ"

*Ірына Чарняўка*

Эсэ беластоцай журналісткі Ганны Кандрацюк пра стваральніка Гудзевіцкага краязнаўчага музея Алеся Белакоза стала пераможцай творчага конкурса "Радыё Свабода". Узнагарода з гэтай нагоды днямі была ўручаная Алесю Белакозу.

Па ўмовах конкурса аўтар лепшага эсэ разам са сваім героем мог наведаць "Радыё Свабода" ў Празе. Ганна Кандрацюк вырашыла, што Алесю Белакозу будзе лепей паехаць разам з жонкай. Але сам Белакоз адмовіўся ад падарожжа, бо мае слабое здароўе, таму па яго жаданню радыё замест паездкі аддало яму кампутар. «Зламалася пячатная машынка, а тут кампутар гэта ж значна лепш! так утылітарна ацэньвае гэтую падзею Алесь Белакоз. Бо што б я цяпер рабіў без машынкі толькі скласці рукі і паміраць!» Сталы эпітэт, з якім ужываецца імя 80-гадовага Алеся Белакоза "няўрымслівы". Эпітэт слушны, бо толькі энергіяй гэтага чалавека ўдалося стварыць унікальны краязнаўчы музей, дзе сярод 13 тысяч экспанатаў адно с першых выданняў "Дудкі Беларускай", напэўна адзіны ў свеце глобус на беларускай мове. Але самае цікавае ў гэтым музеі сам Алесь Белакоз, яго аповеды, яго ацэнкі, успаміны, нават інтанацыі. Беглая экскурсія па музею гэта каля трох гадзінаў, дэталёвая каля васьмі.

Музей гэта тая самая крынічка, каторай сілкуецца беларуская свядомасць і таму Белакоз ніколі не меў лёгкіх часоў, ствараючы яго. А год таму раённыя мастоўскія ўлады фактычна прымусілі яго сысці з пасады дырэктара, выкарыстаўшы прыстойную падставу "па стану здароўя". Хаця адсунуць Белакоза ад яго справы немагчыма сёння з дапамогай "свабодаўскага" кампутара ён піша гісторыю мясцовых мастоўскіх паэтаў і пісьменнікаў памяць пра якіх была бы згубленая без яго энергіі.

працяг на с. 2

# Сьвята Беларускай музыкі

працяг. Пачатак на с.1

І вось, а 16-й гадзіне пачаўся канцэрт. У ім прымалі ўдзел маладыя гурты. Першы дзень - дзень "Вольнай сцэны". Ліў дождж, але ён не перашкаджаў польскай і беларускай моладзі бавіць час пад нэўміручы рок. Дзея скончылася пад ранак, калі хлопцы і дзяўчаты разышліся па намётах, каб адпачыць перад больш стромкай музычнай хваляй.




У наступны дзень канцэрт распачаўся а 14 гадзіне. Першая частка складалася з гуртоў канкурсантаў, а ў другой прымалі ўдзел клясыкі айчыннага року. Сярод польскіх каманд вельмі уразіў гурт "Rima", які выканаў беларускую народную песьню "За туманам". Сёлетняе "Басовішча", як і мінулагоднія фэсты, не абышлося без "NRM", "Нэйра Дзюбеля", "Крамы" і "Ўліс". На вялікі жаль арганізатары не далі "NRM", які выступаў апошні, зрабіць паўнавартасны канцэрт. "Мы ведаем, што вы (моладзь) вельмі чакалі сустрэчы з намі, таму мы будзем граць, пакуль ня вырубяць электрычнасьць,"- сказаў Лявон Вольскі, і выступ "NRM" быў павялічаны на некалькі песень. На жаль, яны выканалі ня ўсе з 32 заплянаваных песень.

Падчас "Басовішча" можна было набыць значкі, кашулькі і плякаты з выявамі фэсту, а таксама плыткі сваіх улюбёных выканаўцаў.

"Басовішча" зьяўляецца добрым падмуркам сяброўства паміж беларускай і польскай моладзю, тэрыторыяй волі і Беларушчыны, чаго так не хапае тут на роднай Бацькаўшчыне.

Спадзяюся, што з цягам часу і на Радзіме можна будзе ладзіць падобныя фэсты.

# ДРОВА ЗАКАЗЫВАЛИ?

*Автор: Глеб ЖИВЛОВ. Белорусская газета.*

На фоне продолжающегося дипломатического конфликта между Беларусью и Польшей проявила себя молодежь страны. Представители идейно полярных объединений - БРСМ и незарегистрированного «Маладога фронта» - на прошлой неделе чуть было не слились в единую массу людей, настаивающих (хоть и по-разному) на дружбе с поляками.

Во время акций у здания польского посольства в Минске иногда казалось, что одновременное нахождение бок о бок бэерэсэмовцев и маладофронтовцев способно вывести внешнюю политику нашей страны на невиданный доселе виток развития. И если первый день совместного пикетирования польского диппредставительства внушал огромный оптимизм, то спустя сутки все сомнения развеялись, а надежды рухнули. Своевременное вмешательство ОМОНа расставило все точки над «ё». В четверг, 4 августа, ровно в полдень мощные юноши и красные девицы с госатрибутикой в руках выстроились напротив столичного парка им. Горького, чтобы в третий раз выразить свое отношение к польским дипломатам, которых становится все меньше и меньше. «Бревно несите, какого… вы тормозите», - обращался к соратникам один из участников начинающегося пикета, поглядывая на часы. Почти без опоздания в месте скопления патриотов появились съемочные бригады ведущих телеканалов. «Все готовы?» - вопрошал один из вожатых пикетчиков, мило улыбаясь появившимся репортерам с камерами и микрофонами.

Операторы дали отмашку, и движение началось. Над юными головами развевались растяжки: «Не рубите вековую дружбу!» и «Дружба и мир - наш ориентир». Во главе колонны шли наиболее резво настроенные и физически подготовленные члены БРСМ, неся на могучих плечах деревянные строительные козлы, бревно с надписью «Дружба» и пилу со стилизованным польским флагом. Глава делегации, секретарь одной из столичных ячеек БРСМ Константин Изотов, облаченный в стильный костюм явно отечественного производства, наверняка ощущал себя причастным к крупным дипломатическим структурам и во время движения, казалось, мысленно повторял слова из подготовленного обращения молодежи РБ к руководству РП. Не успела колонна из нескольких десятков человек пристроиться к забору напротив посольства, как Изотов пламенно изрек в объективы телекамер: «Мы осуждаем действия США и их прихлебателей, которые объявили Беларуси холодную войну и пробуют навязать свою модель демократии». Для пущей убедительности

працяг на с. 4

# Алесь Белакоз: “Веру, што музей не памрэ”

працяг. Пачатак на с.2



Сёння няўрымслівы Алесь Белакоз дзеліцца некаторымі ўспамінамі з чытачамі www.Euramost.org: “...У час нямецкай акупацыі ў Гудзевічах тры маладыя настаўніцы вучылі дзяцей патаемна ў сваіх хатах: адна на польскай, адна на рускай і Вера Мікалаеўа, мая старэйшая сястра, на беларускай. Аднойчы мы сядзім, вучымся а па вуліцы едзе сем нямецкіх падводаў. А хата ля самай дарогі. Пад'ехалі падводы, спыніліся. Вось немцы тупаюць па надворку, ужо адчынілася брамка, дзверы ў кухню... Мы сядзім ні жывыя ні мёртвыя: вось зойдуць у спальню, а ў наступным пакоі мы вучымся і адразу перастраляюць нас! Гэта доўжылася неалькі хвлінаў, але нам гэтыя некалькі хвілінаў здаліся вечнасцю... Але не ўвайшлі, паехалі. Яны паехалі, а Вера Мікалаеўна кажа нам: “Акупанты ўсіх часоў, захапіўшы наш край, хацелі ператварыць нас у рабоў. Вось глядзіце: у Расейскай імперыі мы былі Северо-Западный край, пры Польшчы мы ўжо Крэсы Усходні, пры немцах Прусія. Хто ж мы ўрэшце: рускія, палякі ці немцы?” Мы кажам: “Канешне, беларусы”. А яна кажа: “Кепскія вы беларусы!”. Мы пытаем: “Чаму мы кепскія беларусы?” Яна: “Таму што вы дапамагаеце немцам”. Мы абурыліся: “Мы не дапамагаем немцам!” А яна кажа: “Я вам задала на сёння вывучыць на памяць чатыры часткі паэмы “Курган” а вы не вывучылі. Калі б немцы даведаліся пра гэта, то яны прынеслі вам скрынку цукерак і сказалі б, што мы вашу настаўніцу расстраляем, каб вам галавы не дурыла, а прышлем вам немца”...

Мы пайшлі як пабітыя сабакі. Назаўтра заняткаў не было, а пасля заўтра дзяўчынкі хваліліся, што вывучылі хто шэсць частак паэмы, хто сем частак. Я тады вывучыў усю паэму, але прамаўчаў. Шкадую што не пахваліўся Веры Мікалаеўне, яна была бы радая...

Гэта быў вельмі важны ўрок, самы важны ў маім жыцці... ... Ёсць ў Індуры такі ксенз, Жыліс яго прозвішча, літовец. Людзі казалі што ў яго ёсць рэдкія старажытныя падвоеныя дываны, якія ткаліся толькі на Гарадзеншчыне, а таму і называліся гродзенскімі. Я ведаю, што літоўцы патрыёты, а калі чалавек патрыёт, то ён зразумее іншага патрыёта! Я паехаў да яго ў Індуру. Першы раз яго гаспадыня мяне не пусціла: я пагрукаў у дзверы, павітаўся па-беларуску: “Добры дзень”. Яна адказала, што ксёнза няма. Я паехаў другі раз тое самае, трэці раз тое самае. На чацьверы раз я кажу ёй: “Нех бендзе пахвалёны пан Езус Хрыстус”. Яна кажа: “Навекі! А в якей пан справе”. Кажу: “В справе свентей. В справе Конcтантына Каліновскего”. Яна кажа: “Но, то проше пана!” Выйшаў ксёнз, я яму расказаў, што вось такая справа: робім у Гудзевічах краязнаўчы музей, чуў, што ў вас ёсць старажытныя падвоеныя гродзенскія дываны. Ксёнз, бачу, разумны чалавек, кажа: “У нас ёсць вельмі добры дыван фабрычны” і паказвае вельмі прыгожы дыван. А я думаю: калі я вазьму гэты дыван, то што ён пра нас падумае грабем ўсе, што патрапіцца! Кажу: “Дзякуй, мы збіраем толькі старажытныя рэчы. Гэта вельмі прыгожы дыван, і я вам удзячны, што вы аддаеце, але гэты нас не цікавіць”. Ага, ён бачыць, што я не хапуга, кажа, ідземце, я вам пакажу. І вось дываны 1898 года, 1926 года і адзін без даты ён нам аддаў! Вельмі разумны чалавек быў. Калі мы выязджалі аўтобусам з яго надворку, я папрасіў вадзіцеля спыніцца, каб зачаніць вароты! А ксенз у гэты час чакаў, ці мы вернемся. І як я стаў вароты зачыняць, ён выйшаў і паклікаў мяне, кажа: “Ідземце, у нас ёсць яшчэ старажытныя кніжкі”. І вось тады мы здабылі першыя зборнікі Дуніна-Мацінкевіча, Францішка Багушэвіча, Цёткі, Максіма Багдановіча і тую “Дудку Беларускую”! Я вельмі ўдзячны ксёнзу Жылісу, хоць ён мяне правяраў вельмі разумна і тонка... ...Кампрамісы? Канешне, прыходзілася ісці на кампрамісы, каб захаваць справу. Запрасілі мяне на Гродзенскае абласное тэлебачанне, музей паказаць. Прасілі зрабіць стэндзікі невялікія, я зрабіў, аўтбусам неяк іх давёз. Тады перадачы ішлі ў прамым эфіры. Перад эфірам прайшла рэпетыцыя, пасля яе рэжысер падыходзіць і кажа, што прадстаўнік абкама загадаў, каб не было стэнда Геніюш. Я кажу, што гэта немагчыма. А ён: “Калі вы не знімеце стэнд Геніюш не будзе перадачы. Не будзе перадачы мяне з работы здымуць”. Я падумаў, кажу згодны, здымайце. Знялі. Пачалася перадача. А у мяне быў стэнд пра Элізу Ажэшка, калі да яго дайші, я сказаў: “А гэта Ларыса Геніюш” і расказаў пра яе. Усе прайшло добра. Рэжысер пасля перадачы мне нічога не сказаў, толькі ў кабінеце, калі ніхто не бачыў, пацiснуў руку і выразна паглядзеў у вочы. Праўда, потым гадоў пяць мяне не запрашалі на тэлебачанне..

... “Не знімеце зачыним музей” загадчык раённага аддзела адукацыі загадваў зняць ў музеі стэнд прысвечаны Ларысе Геніюш. А я адгаворваўся: што трэба час, каб з Менску выпісаць іншыя экспанаты, бо калі здыму і людзі ўбачаць пустое месца, будуць пытацца і прыйдзцца ўсё ано расказваць пра Ларысу Геніюш. Хаця ў мяне гэтых экспанатаў было яшчэ на некалькі заляў! А тады беларус Клімук паляцеў у комас. Жонка мая выткала яму гальштук, вучні мае напісалі ліста і мы ўсё гэта яму выслалі. А яшчэ, патаемна ад вучныў я даслаў яму зборнік вершаў Ларысы Геніюш “Невадам з Нёмана” і папрасіў, каб ён падпісаў яго нашаму музею. Ён прыгожа па-беларуску падпісаў: “Гудзевіцкай сярэдняй школе ад Пятра Клімука. Петр Клімук. 06.08.1975 года”, яшчэ даслаў ліст і свой фотаздымак з надпісам. І мы ўсё гэта прыклалі да стэнду Ларысы Геніюш: і ліст, і фатаграфію, і кнігу з подпісам, і канверт “Пошта касманаўта”... ... За першую скульптуру ў нашым тады яшчэ школьным музеі я аддаў 76 рублёў. Гэта была скульптура мясцовага паэта Міхася Явара. Тады я атрымліваў 64 рублі, жонка 57. З гэтай нагоды выклікалі Савет: “Как это Белакоз за свои собственные деньги пробрел бюст кокого-то Михася Явара и установил в школьном помещении?! Кто ему дал право?!” У пратаколе запісалі: “Белакозу указать на самовольные действия”, дырэктару далі строгую вымову за тое што пусціў у школьнае памяшканне “бюст какого-то Михася Явара”, бюст загадалі прыбраць... Па маёй персоне за пяць год, з 1970 па 1975, было праведзена чатыры паседжаня Савета раённага аддзела адукацыі. На кожным білі так, каб не ўстаў! На апошнім паседжанні Савета была вынесеная вымова з апошнім папярэджаннем. За тое, што замест таго, каб згодна з савецкай школьнай праграмай прайсці тры тэмы, я цэлы ўрок расказваў вучням пра Францыска Скарыну. Загадчык райана сказаў, што трэба мяняць альбо савецкія праграмы, альбо Белакоза. Праверкі ў школу наязджалі, трэслі настаўнікаў. Правяральшчыкі заўсёды казалі, што да нас такая ўвага, таму што ў нас музей...

...Недзе ў 1988 годзе прыехаў міністр культуры паглядзець наш музей Але дождж ішоў, то я міністру кажу, каб абуваў тапачкі, перш чым ісці ў залю. Ён абурыўся, буркнуў: “Тапочки есть, музея нету”. Ну, нету так нету. Прыйшлі ў першую залю, ён агледзеўся, кажа : “Слушайте, у вас тут все оригиналы! Школьный музей это всегда копии. Хорошо! Очень интересно!” Прайшоў у другую залю: “Слушайте, у вас тут тоже все оригиналы, ни одной копии!” “Ды не: вось здымак Карпюка копія” “Замечательный музей!”. Прыйшлі ў хатку, хатка мае 200 гадоў, “Слушайте, надо делать государственный музей!”. Кажу, што я не згодзен з гэтым. “Чаму?” “Бо вы ж потым скажаце: гэтае здымі, гэтае павесь”. “Скажам” “А нашто мне гэта?” Ну, ён паабяцаў, што так камандаваць намі ніхто не будзе, то я і пагадзіўся. Ад зарплаты я адмовіўся, бо кіраваць музеям магу і без яе. Далі нам сем ставак ад навуковых супрацоўнікаў да прыбіральшчыц. Але ж план па квітках давялі на гэты год мільён шасцьсот тысяч!...

...Калі мяне ціснулі тады, ў 60-70 гады, мне здавалася, што я адзіны такі ў цэлым свеце. Гэта вельмі страшна, калі ты адзін. Але потым я ўбачыў, што маіх аднадумцаў шмат і з кожным годам становіцца ўсё больш... Я не ведаю, каму ўсё гэта пакіну. У сыноў сваё жыццё, свая праца, яны не будуць займацца музеям. Але веру, што музей не памрэ...

■

# ДРОВА ЗАКАЗЫВАЛИ?



працяг. Пачатак на с. 2

один из распиловщиков дружеского бревна был выбрит наголо и одет в майку цвета хаки. На подхвате у него стояли двое в тельняшках. «А ваше собрание санкционировано?» - наивно вопрошал у бээрэсэмовцев один из «нячэсных» журналистов. «Я не в курсе», - коротко отвечали участники акции. «А с чем вы не согласны? - с улыбкой интересовался журналист. - По поводу чего митингуете?» - «Это наша позиция. В ответ на действия польских властей», - не очень уверенно отвечал один из обладателей нарядного галстука, напрочь отказавшись говорить о скандале вокруг Союза поляков.

Симпатичная девушка (сразу даже не скажешь, что из БРСМ) вынесла к посольским воротам весы базарного типа и заявила: «Мы положим на одну чашу весов эти помидоры, символизирующие политику в кавычках, а на другую чашу - отпиленные куски от бревна «Дружба» с надеждой на то, что здравый смысл восторжествует». «Не должно быть никаких силовых акций, - миролюбиво делился своим мнением с корреспондентом «Белорусской газеты» Сергей Черняк, первый секретарь Первомайского райкома БРСМ. - Нужно обойтись без метания камней и помидоров. Мы - за компромисс. Наша задача - предотвратить любую агрессию». В молодежной патриотической акции приняли участие даже пенсионеры. «Я случайно узнал об этой акции, - не моргнув глазом, сказал Иван Иванович с красно-зеленым стягом в руках. - Это мой личный флаг, наша гордость. Я считаю, что во всем виновата Польша. Мне стыдно за них, забывших историю». В рассказе дедушки об истории было много интересного, но, расслышав в адресованных ему вопросах нечто непохожее на учебник истории для младших классов, он лишь махнул рукой: «Да что с вами разговаривать, все равно все переначите».

Не прошло и получаса, как у польского посольства появились активисты «Маладога фронта», держащие в руках листки с надписью «Польшча + Беларусь = Салідарнасць». «Мы хотим показать, что пропрезидентская молодежь - это не весь белорусский народ. Мы не пилим дружбу. Мы пришли показать полякам, что политика провластных организаций - это не политика Беларуси и белорусского народа», - заявил один из лидеров «МФ» Дмитрий Дашкевич и пообещал прийти на следующий день одновременно с активистами БРСМ. Молодой оппозиционер слово сдержал, и уже в пятницу днем патриоты на разных языках дискутировали друг с другом: «А вы чего здесь?» - «А вы?» - «Те, кто не согласен с политикой Лукашенко, уезжайте из страны!» - агрессивно выкрикивал один из представителей БРСМ. «Это моя страна, и я буду здесь жить», - сквозь зубы отвечал ему активист «МФ». Неизвестно, чем бы все могло закончиться, но почти совместная акция БРСМ и «МФ» у польского посольства завершилась по-белорусски. Спустя несколько минут возникли сотрудники столичного ОМОНа, и пятеро членов «Маладога фронта» оказались в автобусе. При этом чуть было не задержали нескольких активистов БРСМ. За спинами сотрудников правоохранительных органов взвились бумажные ромашки с надписями «Давайте вместе бороться против глобализации по-американски» и «Славяне - соединяйтесь, НАТО - сопротивляйтесь». Не хватало только надписи «Беларусь - для белорусов».

Вечером того же дня активисты «МФ» Дмитрий Дашкевич и Артур Финькевич получили по 10 суток административного ареста, а члены БРСМ заявили о готовности до упора публично пилить бревно.

# Копить - не копать

■ ***Автор: Сергей ЖБАНОВ. Белорусская газета.***

Министр труда и соцзащиты Антонина Морова на минувшей неделе искусно напомнила президенту о том, что пора повышать пенсии: «Для того чтобы выйти на прогнозные показатели. Деньги в фонде есть. И все ждут, поскольку у нас перерасчеты в феврале, августе традиционно были». Александр Лукашенко оправдал ожидания пенсионеров - «самой сознательной части общества», великодушно санкционировав перерасчет пенсий в сентябре. Масштабы запоздалой щедрости государства пока неизвестны, что является основанием для самых оптимистичных прогнозов. Например, можно сравнить динамику среднего размера трудовой пенсии в России и Беларуси. Затем, экстраполируя некоторые простейшие закономерности, можно с высокой степенью вероятности определить размер процветания, на который может рассчитывать среднестатистический белорусский пенсионер.

На 1 августа 2004г. средний размер трудовой пенсии в России составлял RUR2195 ($75,7 в эквиваленте), а в Беларуси - Br165.500 ($77). К 1 июля 2005г. соотношение этих величин характеризовалось следующим образом: в России - RUR2521 ($88,1), в Беларуси - Br197.900 ($92). Таким образом, средняя трудовая пенсия в Беларуси за этот период увеличилась на Br32.400 ($15). К 1 сентября 2005г. белорусская пенсия, соблюдая сложившийся темп прироста, могла бы составить Br204.300 ($95). Но с 1 августа средний размер пенсии в России уже повышен до RUR2745 ($96). Поэтому Минтруда РБ в своих расчетах средней пенсии должно исходить из $100, а не ограничивать себя количеством собранных денег в фонде или установившимся соотношением пенсии со средней зарплатой в 42%.

По мнению президента, «в отличие от соседних стран пенсионеры в Беларуси не предъявляют к власти больших претензий». Следовательно, наш пенсионер, разделяющий уверенность правительства в преимуществах белорусской социально-экономической модели, вправе рассчитывать и на большее.

Эти надежды во многом связаны с проектом закона «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы РБ по вопросам пенсионного обеспечения», который уже одобрен президентом. Проект «направлен на изыскание внутренних резервов пенсионной системы и на развитие социального страхования». Внесенные изменения избавляют Фонд соцзащиты от выплаты пенсий, назначаемых безработным до достижения общеустановленного пенсионного возраста. Теперь эта почетная обязанность выпадает на долю средств госфонда содействия занятости.

Новый закон предусматривает введение пятилетнего минимального периода уплаты обязательных страховых взносов для назначения пенсии по возрасту. Это обяжет работников более активно участвовать в финансировании пенсионной системы и позволит исключить случаи назначения трудовой пенсии с учетом стажа, состоящего в основном из «кредитных» периодов, включающих обучение, уход за детьми, проживание за границей с супругом, работающим в белорусских загранучреждениях и т.д.

Более радикальных изменений в методах сбора пенсионных средств закон не предполагает. В ответ на сообщение Антонины Моровой о разработке белорусского клона шведской пенсионной модели Александр Лукашенко рекомендовал Минтруду планировать увеличение поступлений в Фонд соцзащиты на основе роста экономической эффективности производства и зарплаты, не надеясь в ближайшей перспективе на увеличение пенсионного возраста и тарифов страховых взносов.

Скорее всего, белорусско-шведская модель будет внедрена при следующем президенте, поскольку сегодня на 100 работников приходится 60 пенсионеров. По демографическим прогнозам, их число сравняется только к 2030г. В России эту беду ожидают на десять лет раньше - к 2020г. Поэтому у россиян уже сегодня внедрена накопительно-страховая пенсионная система. Нам этот буржуазный кошмар при Лукашенко явно не грозит. Говорить о преимуществах модернизированной российской системы начисления пенсий пока не приходится. Есть основания полагать, что пенсионные накопления граждан России ко времени их выхода на пенсию будут изрядно обглоданы инфляцией. Совместить 11-12% годовой инфляции с надеждами на достойную старость практически невозможно. При таких темпах роста цен волей-неволей согласишься с предложением Лукашенко копить «на добровольных началах». Чем, собственно, и занимается в индивидуальном порядке большая часть населения независимо от возраста. А накопительно-страховая система придает этому занятию организованный и обязательный характер, лишая граждан права выбора инструмента инвестирования.

И это явный перебор. Белорусско-шведскую пенсионную систему Морова назвала «условно-накопительной». Осталось догадаться: почему? Есть два варианта ответа. Первый заключается в условном результате коллекционирования денег, достигаемом при высокой инфляции. Второй - более печальный, поскольку соискатель повышенной пенсии не успевает воспользоваться ни базовой, ни накопительной частью пенсии. Согласно статистике, белорусские мужчины живут в среднем по 63 года и, следовательно, имеют научно обоснованную биологическую причину для досрочного ухода на покой. Как, например, это делает в Беларуси каждый третий пенсионер в связи с неблагоприятными условиями труда. Но каждый пятый пенсионер продолжает упорно трудиться.К этому их подталкивает величина пенсии, обеспечивающая только 95% величины минимального потребительского бюджета пенсионера. Понятно, что внедрение накопительно-страховой системы заметно увеличит число пенсионеров, ищущих счастье в труде. Вместе с тем увеличатся взносы в Фонд соцпомощи, но отнюдь не шансы пенсионеров-трудоголиков прогулять собранную коллекцию дензнаков.Поэтому Фонду придется делиться унаследованной накопительной частью с родственниками, чтобы у пенсионеров не возникло соблазна устраниться от решения общегосударственных задач, собирая деньги по старинке - в матрасах и на депозитных счетах. Иначе новая пенсионная система просто превратится в дополнительный источник пополнения республиканского бюджета.

**Мастоўская праўда + *дайджэст***
e-mail для ліставаньня : masty.prawda@hotmail.com
Выдавец: Аляксандр Зарэмбюк
Дызайн і вёрстка: Сяргей Губарэвіч
Рэдактар: Алеся Смольская
Наклад : 299 ас.
Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасьць за падбор і дакладнасьць фактаў
**Адрас рэдакцыі: вул. Я. Купалы 1, 231600 Масты, Гарадзенская вобл., Беларусь**